# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА
# БЕЛАРУСКАЯ МОВА
# (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

## АСНОЎНЫЯ МЭТЫ ВЫКЛАДАННЯ:

– выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі граматнага карыстання вуснай і пісьмовай беларускай мовай;

– пашыраць і ўзбагачаць прафесійны лексічны запас будучых спецыялістаў, выпрацаваць уменне практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці;

– выхоўваць любоў і павагу да роднага слова, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі і г. д.

## ЗАДАЧЫ ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ:

– даць студэнтам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе тэрміналогіі і маўленчай культуры беларускай мовы;

– дапамагчы студэнтам усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і духоўным адраджэнні нацыі;

– развіваць моўна-эстэтычны густ студэнтаў, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы ў сітуацыі дзяржаўнага білінгвізму і г. д.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

– ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;

– функцыі беларускай мовы ў грамадстве;

– месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;

– сістэму лексічных, граматычных, стылістычных сродкаў беларускай мовы, у тым ліку і прафесійнай сферы;

– тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці;

**умець:**

– граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай;

– адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю;

– перакладаць анатацыі і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;

– складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні і г. д.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” прызначаны для забеспячэння атрымання вышэйшай адукацыі і павышэння яе якасці. ЭВМК пабудаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта да падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасцях УА “Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія”.

ЭВМК мае на мэце аб’яднаць і сістэматызаваць вучэбныя і метадычныя матэрыялы і дыдактычныя сродкі навучання. ЭВМК уключае ў сябе наступныя раздзелы: тэарэтычны, практычны, кантролю ведаў і дапаможны.

У тэарэтычным раздзеле змешчаны курс лекцый па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, указана тэматыка рэфератыўных работ.

У практычны раздзел уключаны метадычныя дапаможнікі, рэкамендацыі і ўказанні па правядзенні практычных заняткаў, матэрыялы для замацавання ведаў, выпрацоўкі ўменняў і навыкаў, самастойныя працы, прэзентацыі, прысвечаныя тэме “Мова і соцыум” і вядомым беларускім асветнікам, друкарам, дзеячам культуры і іх ролі ў развіцці беларускай нацыянальнай культуры.

Раздзел кантролю ведаў змяшчае пералік заліковых пытанняў для стацынара і завочнага аддзялення, навуковыя тэксты прафесійнай накіраванасці для перакладу і напісання заліковых анатацый.

Дапаможны раздзел змяшчае базавую вучэбную праграму па дысцыпліне “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, спіс літаратуры з пералікам вучэбных выданняў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, рэкамендаваных студэнтам для вывучэння дысцыпліны “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”.